Андрэй Вашкевіч
(Гродна)

Навуковая спадчына ксяндза Вінцэнта Гадлеўскага

У 1928 годзе Інстытут беларускай культуры ў Менску выдаў першы (і, напэўна, апошні) том „Матар'ялаў да географіі і статыстыкі Беларусі". Большую частку тома займала праца маладога таленавітага географа Гаўрылы Гарэцкага „Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы (нацыянальны склад насельніцтва Заходняй Беларусі)". Выданне, забяспечанае некалькімі дзесяткамі карт і табліц, спасылкамі на работы бадай што ўсіх пісаўшых пра Беларусь у канцы XIX — пачатку XX ст. мясцовых і замежных географаў і этнографаў, уражвала сваёй грунтоўнацю. Паводле Гарэцкага, які ў сваіх доследах карыстаўся моўным прынцыпам вызначэння этнічнай прыналежнасці насельніцтва Заходняй Беларусі, беларускіх землях пад Польшчай у 1928 г. жыло 2 млн. 893 тыс. (74,9% ад усяго насельніцтва) беларусаў[1]. У той жа самы час польская афіцыйная статыстыка (перапіс 1921 г.) налічвала ў Польшчы крыху больш 1 млн. беларусаў (неафіцыйная 1,5 млн.). Такая вялікая розніца паміж польскай і беларускай статыстыкай тлумачылася даволі проста: польская статыстыка аўтаматычна залічыла ў лік палякаў усіх каталікоў, якія ў штодзённым жыцці карысталіся беларускай мовай, аднак у значнай ступені выказвалі польскую нацыянальную свядомасць[2].

[1] Г. Гарэцкі, *Межы Заходняй Беларусі ў Польшчы*, [у:] *Матар'ялы да географіі і статыстыкі Беларусі*, том першы, Менск 1928, с. 57.

[2] Насамрэч, бадай што ніхто з сучасных даследчыкаў не здолее даць адказу на пытанне, колькі сярод беларускамоўных каталікоў Заходняй Беларусі ў адмежак часу 1921-1939 гг. было людзей, што адназначна дэкларавалі сябе палякамі, а колькі гаварылі, што яны, скажам „простыя людзі", але належаць да „польскай веры". Тое самае тычыцца і праваслаўных, сярод якіх, апроч саманазвы „тутэйшыя", тады яшчэ былі даволі пашыраныя саманазвы „просты чалавек", „русін", „чалавек рускай веры" або нават „літвін".

У снежні 1931 г. ў Польшчы быў праведзены другі агульны перапіс, вынікі якога пераўзышлі нават самыя трывожныя чаканні беларускай інтэлігенцыі. Ад ліку беларусаў былі аднятыя не толькі каталікі, але і большая частка насельніцтва Палескага ваяводства, запісаная ў лік карыстальнікаў „тутэйшай" мовай і, адпаведна, „тутэйшых". Беларусаў паводле афіцыйных дакументаў заставалася менш 1 млн. чалавек.

Адрэагаваць на вынікі гэтага перапісу ў Менску бадай што ўжо і не было каму, пасля чысткі 1930 года проста не засталося адпаведных навуковых кадраў, а „нацдэмаўскую" работу Гарэцкага схавалі ў спецхранах і ніякіх спасылак на яе не рабілі нават у пасляваенныя гады[3]. Выказацца ад імя беларускай грамадска-палітычнай эліты прыйшлося ксяндзу Вінцэнту Гадлеўскаму, які восенню 1937 года ў трох нумарах — № № 11 (20) — 13 (22) — сваёй газеты „Беларускі Фронт" надрукаваў невялікае статыстычнае даследаванне пад назвай „Лік беларусаў у Польшчы".

Сваю работу кс. Гадлеўскі (дарэчы, як і Г. Гарэцкі) угрунтаваў на двух асноўных прынцыпах:

1. Паміж палякамі і беларусамі існуе трывалая этнічная мяжа, што праходзіць крыху на захад ад Беластока па былой мяжы Вялікага княства Літоўскага і Кароны Польскай. Значыць, усё аўтахтоннае насельніцтва на ўсход ад гэтай мяжы не можа быць этнічна польскім — заходнеславянскім. Мясцовыя каталікі і праваслаўныя — гэта або ўсходнія славяне, або нашчадкі асіміляваных усходнімі славянамі балтаў. Ніякага мяшанага беларуска-польскага арэалу ў Заходняй Беларусі не існуе.

2. Запісаныя гаворачымі па-польску каталікі Заходняй Беларусі насамрэч карыстаюцца ў штодзённым жыцці беларускай мовай, што дае магчымасьць аднесці іх да беларускай этнаграфічнай масы. Выказванне імі польскай нацыянальнай свядомасці з'яўляецца вынікам псеўдаасіміляцыйных працэсаў, калі насельніцтва залічвае сябе ў лік палякаў пад уздзеяннем найперш касцельнай прапаганды і пры гэтым застаецца беларускім па сваёй мове і звычаях. Кс. Гадлеўскі размяжоўвае паняцці „этнаграфічная маса" і „свядомае сваёй нацыянальнасці" насельніцтва. Думаю, што ў разуменні

[3] У пасляваенны час паміж польскімі і савецкімі беларускімі гісторыкамі назіраўся пэўны кампраміс адносна пытання аб колькасці беларусаў у Другой Рэчы Паспалітай: ад 2 да 2,5 млн. чалавек. Глядзі: E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik, *Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku*, Białystok 2005, s. 44; A. Bergman, *Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej*, Warszawa 1984, s. 14; *Революционный путь компартии Западной Белоруссии*, Минск 1966, с.17.

рознасці гэтых паняццяў найперш і крыецца галоўная праблема вызначэння этнічнага складу насельніцтва перадваенных Крэсаў як для ранейшых, так і сучасных даследчыкаў.

Ксёндз Гадлеўскі фактычна высмейвае вынікі перапісу 1931 г. адносна роднай мовы жыхароў Заходняй Беларусі і, адпаведна, іх нацыянальнасці. Каталікоў, што гавораць пацеры па-польску, запісалі палякамі, беларускамоўных палешукоў, што не назвалі сваю мову беларускай — „тутэйшымі". Чаму ж у такім выніку ксяндзоў, што моляцца па-лацінску, не запісалі належачымі да лацінскай нацыі? Чаму таксама ў іншых ваяводствах, апрача Палескага, не аказалася „тутэйшых", бо і на ўсіх астатніх Крэсах жыла маса людзей (і праваслаўных, і каталікоў), што не называлі сябе ні беларусамі, ні палякамі?

Канцэпцыя падлікаў кс. Гадлеўскага адносна „ўнутраных" (што знаходзіліся ў глыбіні беларускай этнічнай тэрыторыі) беларускіх паветаў была даволі простай — ад агульнай колькасці жыхароў павета адымаліся яўрэі (местачкоўцы і гараджане), рускія (парэшткі царскай яшчэ інтэлігенцыі і чынавенства, дзе-нідзе таксама стараабрадцы) і нязначны працэнт каталікоў (польскія чыноўнікі і інтэлігенцыя з цэнтральнай Польшчы, асаднікі — агулам не больш 2-3% ад агульнай колькасці), выніковая лічба давала колькасць беларускай этнаграфічнай масы ў тым ці іншым павеце. З паветамі „знешнімі" (праз якія праходзіла мяжа беларусаў з іншымі этнасамі) было трохі складаней. На беларуска-літоўскім памежжы ў большасці выпадкаў беларусы аддзяляліся ад літоўцаў паводле мовы. Што тычыцца паўночна-заходніх ваколіцаў Вільні, кс. Гадлеўскі падрэсліваў, што пальшчызна мясцовых жыхароў — рэзультат паланізацыі мясцовага беларуска-літоўскага асяроддзя. Дарэчы сказаць, што паўночна-заходнія ваколіцы Вільні былі бадай што адзіным у Заходняй Беларусі сельскім рэгіёнам, дзе хатнюю мову мясцовых жыхароў з вялікімі агаворкамі можна было назваць польскай. Мяжа з палякамі і ўкраінцамі праходзіць прыкладна па мяжы былога Вялікага Княства Літоўскага і Кароны ўзору 1596-1795 гг. Гэтая выснова ксяндза была пацверджана пасляваеннымі доследамі беларускіх і польскіх вучных: гісторыкаў, этнолагаў, філолагаў[4]. Аўтару дадзенага артыкула таксама давялося праверыць вывады кс. Гадлеўскага на лакальным узроўні, датычна тэрыторыі былога Аўгустоўскага павета (спачатку Сувалкскай губерні,

[4] Карты з вынікамі даследаванняў Ежы Вісьнеўскага і філолагаў з Польскай акадэміі навук глядзі: Е. Е. Ширяев, *Беларусь, Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах*, Минск 1991, с. 67-69.

а пасля Беластоцкага ваяводства). Пацвердзіліся яны як падчас працы з навуковай літаратурай, так і ў выніку палявых даследаванняў[5].

Такім чынам і тут не выпадала гаварыць аб значных памылках у падліках.

У канцэпцыі „этнаграфічнай масы" заключаўся яшчэ і вельмі моцны ідэалагічны падтэкст. Кс. Гадлеўскі імкнуўся падкрэсліць агромністы патэнцыял беларускай этнаграфічнай масы, яе стыхійную сілу і самабытнасць. Ва ўмовах слабога развіцця капіталістычных адносін на Крэсах, нешматлікасці гарадоў, невялікай сеткі польскамоўных школ і г.д. паланізацыя мясцовага вясковага беларускага насельніцтва магла працягвацца многія дзесяцігоддзі і невядома, ці нават праз гэты час здолела б ахапіць шырокія масы беларусаў. Аўтары „Беларускага Фронту" не стамляліся падкрэсліваць, што беларусы — гэта дрыгва, якая, будучы звонкі пасіўнай, засмоктвае ўсіх, хто судакранаецца з ёю. Менавіта таму яшчэ і ў 1930-х. гг. на беларускую мову пераходзілі цэлыя населеныя літоўцамі воласці на Віленшчыне, пачыналі гаварыць па-беларуску дзеці польскіх асаднікаў.

Вельмі турбавала кс. Гадлеўскага пытанне аб пашырэнні сярод каталіцкага насельніцтва Заходняй Беларусі беларускай нацыянальнай свядомасці.

Усяго беларускамоўных каталікоў (фактычна тых каталікоў, што прызналі сябе беларусамі) аказалася па перапісе 1931 года каля 7% ад агульнай колькасці каталікоў на Паўночна-ўсходніх Крэсах, агулам недзе 70 тысяч чалавек[6]. Гэта былі ўжо абсалютна свядомыя беларусы-каталікі, якія, у пераважнай большасці паходзячы з каталіцкага-„польскага" асяроддзя, прыйшлі да беларускасці шляхам уласнай ідэйнай эвалюцыі. Усе яны былі, як правіла, рэзультатам дзейнасці беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў і электаратам БХД. У матэрыялах перапісу 1931 г. даецца заўважыць толькі два месцы, дзе колькасць беларускамоўных пераўзыходзіла колькасць праваслаўных — гэта Свянцянскі павет, дзе мінімум 6 тысяч каталікоў падалі беларускую мову сваёй роднай і Пастаўскі павет, дзе беларусаў-каталікоў аказалася мінімум 4 тысячы. У іншых паветах беларусы-каталікі не прасочваліся найперш дзеля таго, што іх нязначная колькасць (пераважна па некалькі соцень чалавек) перак-

[5] А. Вашкевіч, *Беларускае насельніцтва Аўгустоўскага павета Сувалкскай губерні (др. п-ва XIX — пач. XX стст)*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2004, nr 21; яго ж, *Грэка-каталіцкае насельніцтва Аўгустоўшчыны ў канцы XVIII — пачатку XX ст. Канфесійныя змены і фарміраванне нацыянальнай свядомасці*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2005, nr 24.

[6] P. Eberhardt, *Przemiany narodowościowe na Białorusi*, Warszawa, b. r. wyd., s. 83.

рывалася большай колькасцю г.зв. „праваслаўных палякаў”. Возьмем, напрыклад, Вілейскі павет: каталікоў — 53 тыс., праваслаўных — 71 тыс.; па-польску гаварыла (фактычна палякі) 59 тыс., па-беларуску (фактычна беларусы) — 64 тыс. Значыцца, 6 тысяч праваслаўных падалося за гаворачых па-польску і, значыць, палякаў. Насамрэч, гэтых „праваслаўных палякаў” магло быць і 7, і 8 тысяч, у сваю чаргу 1-2 тысячы каталікоў маглі падаць сябе беларусамі. На жаль, па гмінах і вёсках (як у 1921 г.) матэрыялы перапісу 1931 г. надрукаваныя не былі, таму праверыць гэтыя здагадкі цяжка, але агульная лічба вядомая, амаль 70 тысяч каталікоў-беларусаў стварылі вельмі небяспечны для польскай адміністрацыі на Крэсах прэцэдэнт — лаяльная да Польшчы каталіцкая этнаграфічна беларуская (а па саманазве польская) маса пачала ўсведамляць сваю прыналежнасць да беларускага этнасу. Такім чынам змаганне за нацыянальнае самавызначэнне каталікоў Заходняй Беларусі ніяк нельга было прызнаць скончаным нават напрыканцы 1930-х гадоў. Аб гэтым гаварылі і адказныя асобы польскай адмінстрацыі, якія падкрэслівалі, што „польскае насельніцтва не з’яўляецца зусім нацыянальна свядомым і ў пэўных умовах можа перайсці ў іншую этнічную групу”[7].

Прапанаваны ніжэй тэкст падаецца з захаваннем моўных асаблівасцей арыгінала.

Ксёндз Вінцэнт Гадлеўскі

Лік беларусаў у Польшчы

Паводле агульнага перапісу насельніцтва з 1921 г. польская афіцыяльная статыстыка падавала лік беларусаў у Польшчы на 1 мільён 100 тысяч. Пасьля таго, як вярнуліся на бацькаўшчыну „бежанцы” і ўлічваючы натуральны прырост „Sprawy Narodowościowe” (орган польскай меншасьцёвай палітыкі) у артыкуле „Лік і разьмяшчэньне беларусаў у Польшчы” (№ 3-4 з 1928 г.) падалі лік беларусаў у Польшчы на 1 590 000 душ. Гэтакі лік меў быць на дзень 1.1.1928 г. Гэтакая лічба беларусаў у неафіцыяльных кругох была агульна прынята аж да наступнага перапісу з 1931 г., пасьля якога тыя-ж „Sprawy Narodowościowe” падавалі лік беларусаў пачаткова на 1 520 000 а потым роўна 1 600 000. Знаючы тэндэнцыі некаторых перапішчыкаў, якім кожны не паляк мусіў моцна цьвярдзіць аб сваёй народнасьці, можна сказаць, што такая лічба сьведчыла аб існаваньні паўтарамільённай *сьведамай* беларускай масы, якая *дамагалася*, каб яе запісалі беларусамі

[7] E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik, *Zmiana struktury narodowościowej...*, s. 50.

Зразумелая рэч, што беларусы адносіліся да польскай статыстыкі з недаверам, цьвердзячы, што сапраўдны лік беларусаў у Польшчы куды большы, што гэныя паўтара мільёна яшчэ ня вычэрпываюць усяе *этнографічнае* беларускае масы. Але праўду кажучы, ня было яшчэ з беларускага боку працы, якая б выказвала хоць-бы прыбліжаную лічбу гэтай масы. Гаварылася аб паўтраці да трох мільёнаў беларусаў у Польшчы, але гэты лік быў сумарычны, не даючы дакладнейшага малюнку ані расьсяленьня беларусаў, ані іх ліку.

Да напісаньня гэтага артыкулу прычыніліся тыя-ж „Sprawy Narodowościowe", якія ў 1-2 нумары сёлета падалі ўсьлед за афіцыяльнай статыстыкай паводле апошняга перапісу з 1931 г. лік беларусаў на 987 952 душы, а дадаючы натуральны прырост, „Sprawy Narodowościowe" кажуць, што лік беларусаў на 30.VI.1937 ня многа перайшоў за мільён. Значыць, паводле польскай статыстыкі лік беларусаў паменеў на 600 тысяч, чаго быць не магло, бо ўсім ведама, што беларускай этнаграфічнай масы прыбыло і да гэтага сьведамасьць у гэтай масе пашырыліся. З гэтага відаць, што ў польскай статыстыцы ня ўсё ў парадку.

Прабуючы даць верны абраз беларускага насельніцтва ў Польшчы, мы адчуваем усе звязаныя з такой пробай труднасьці. Прадусім ня маем магчымасьці зрабіць свайго перапісу, так як робяць польскія дзейнікі, а ведама, што лік таго ці іншага насельніцтва залежыць часта да таго, *хто* робіць перапіс. Другой труднасьцяй зьяўляецца яшчэ нястача нацыянальнага ўсьведамленьня ў шырокіх кругох нашага жыхарства, якое найчасьцей азначае сябе паводле веры, прыгэтым зусім памылкова („польская" і „руская" вера), а трэцяй — нястача выразнай мяжы паміж беларусамі і некаторымі суседнімі народнасьцямі, асабліва ўкраінцамі на Палесьсі. Здаючы справу з гэтых труднасьцяў, мы падыходзім да статыстычных досьледаў вельмі асьцярожна, з аднаго боку не догматызуючы іх, а з другога — стараючыся аднак абапёрці нашу статыстыку на фактычных даных. Помачай для нас будзе тая-ж польская статыстыка, а над усё наша *дакладная знаёмасьць* абшараў, заселеных беларусамі. Абшары гэтыя мы знаем ня толькі з кніжак, але і з жыцьцёвага досьледу, бо мы выйшлі з гэтага краю і зьведалі яго ўздоўж і папярок. Падставай для нашай статыстыкі ня будзе народная сьведамасьць, але этнографічная маса. Польская статыстыка брала за падставу нацыянальнае ўсьведамленьне і пісала беларусамі тых, хто аб гэтым заяўляў, а нават гэтага жадаў, а мы будзем пісаць тых, хто дома ў сябе гаворыць пабеларуску, хто з свайго жыцьця, з сваіх звычаёў і абычаёў належыць да цела беларускага народу, іншымі словамі, будзем рабіць статыстычныя падлічэньні

беларускай этнографічнай масы. Паступаць гэтак маем тыя прычыны, што працэс усьведамленьня беларускіх мас яшчэ ня скончыўся, а этнографічная маса, хоць-бы і нясьведамая, ёсьць *in potentia* матар'ялам беларускім, да якога з часам можа прыйсьці ўсьведамленьне і ён станеца беларускім фармальна, ня толькі целам але і душою. Вялікая шкада, што ня маем яшчэ статыстычных даных паводле гмін, гэта дало-б нам магчымасьць зрабіць болей дакладны падрахунак беларускага насельніцтва ў Польшчы. Да гэтакага падрахунку вернемся тады, калі пакажуцца ў сьвет болей дакладныя статыстычныя аблічэньні, а цяпер будзем падаваць іх *сумарычна*, паводле паветаў.

Віленскае ваяводзтва.

Браслаўскі павет займае прастору 3 217 кв. км., на адзін кв. кілёмэтр выпадае 34 чалавекі. Насельніцтва 143 тыс. (падаём у круглых лічбах), каталікоў 89 тыс., праваслаўных 30 тыс., жыдоў блізу 8 тыс., іншых, прадусім стараверaў 16 тыс. Паводле бацькаўскай мовы: польская — 94 тысячы, беларуская 23 тыс., расійская 14 з паловай тысяч, літоўская 3 з паловай тысячы, жыдоўская 7 тысяч, іншых — да 1 тысячы. Глянуўшы на гэтыя лічбы, адразу кідаецца ў вочы вялізарная лічба гаворачых папольску ў Браслаўшчыне, тады калі ўсім ведама, што ў гэтым павеце агульна-ўжыванай мовай ёсьць мова беларуская, а польская ў штодзённым жыцьці трапляецца вельмі рэдка. Прыгэтым трэба сьцьвердзіць, што ў заходняй частцы павету (на захад ад Відзаў і ў ваколіцы Дукшт) гавораць палітоўску. Паводле нашых аблічэньняў гаворачых пабеларуску ў Браслаўскім павеце ёсьць найменш 100 тысяч, прыгэтым засьцерагаемся, што можа быць болей.

Дзісьненскі павет мае прастору 3 968 кв. км, насельніцтва 160 тысяч, на 1 кв. км. 40 чал., каталікоў 57 тыс., праваслаўных 88 тыс., жыдоў 12 тыс., іншых 3 тысячы. Польская мова 62 тыс., беларуская 80 тыс., расейская 5 тыс., жыдоўская 12 тысяч, іншых да 1 тыс. Як бачым, лік ужываючых польскай мовы паводле гэтай статыстыкі большы, чым лік каталікоў, а лік гаворачых пабеларуску меншы, чым лік праваслаўных. Значыць і тут афіцыйная статыстыка кульгае. Дзісненшчына належыць да найболей беларускіх паветаў, там і праваслаўныя і каталікі гавораць пабеларуску, стараверaў зусім мала, а калі адлічым іх, жыдоў і гаворачых папольску, то астанецца добрых 135 тысяч, гаворачых пабеларуску.

Маладэчанскі павет мае прастору 1 898 кв. км, насельніцтва 91 тысячу, на 1 кв. км. 48 чал., каталікі 21 тыс., праваслаўныя 54 тыс., жыды 6 тыс.; польская мова 36 тыс., беларуская 49 тыс., жыдоўская 6 тыс., расейская 700 чалавек. Таксама адзін з найболей бела-

рускіх паветаў, паводле нашага абрахунку ёсьць там каля 80 тысяч беларусаў.

Ашмянскі павет прастору 2 362 кв. км, насельніцтва 104 тысячы, на 1 кв. км. 43 чал., каталікоў 81 тыс., праваслаўных 15 тыс., жыдоў 7 тыс., іншых 1 тысяча; польская мова 85 тыс., беларуская 10 тыс., жыдоўская 7 тыс., літоўская 1 560 чалавек, расейская 800 чалавек, рэшта іншыя. Гэты павет у большасці каталіцкі, дык польская статыстыка залічвае яго да паветаў польскіх. Мы, аднак, знаючы дакладна насельніцтва гэтага павету, сьцьвярджаем, што яно гаворыць пабеларуску, і то ня толькі праваслаўныя, але і каталікі. Каталікі толькі гавораць пацеры папольску, але гэта яшчэ не дае падставы залічыць іх да польскай нацыі, так як ня можна залічыць каталіцкіх ксяндзоў да лацінскай нацыі на тэй падставе, што адгаворваюць лацінскія пацеры. Дзеля гэтага сьцьверджаем, што Ашмянскі павет ня ёсьць этнаграфічна польскім, а беларускім і лік беларусаў у ім перавышае 85 тысяч.

Пастаўскі павет прастору 3 050 кв. км, насельніцтва 100 тысяч, на 1 кв. км. 33 чал., каталікоў 51 тыс., праваслаўных 44 тыс., жыдоў 3 тыс., іншых 2 тысячы; польская мова 48 тыс., беларуская 48 тыс., жыдоўская 3 тыс., расейская 1 тыс. Паводле нашага аблічэньня у гэтым павеце ёсьць беларусаў каля 90 тысяч.

Сьвянцянскі павет прастору 4 017 кв. км, насельніцтва 136 тысяч, на 1 кв. км. 34 чал., каталікоў 117 тыс., праваслаўных 2 тыс., стараверaў каля 10 тыс., жыдоў 7 тыс.; польская мова 68 тыс., беларуская 8 тыс., расейская 9 тыс., літоўская 43 тыс., жыдоўская 7 тысяч, рэшта іншыя. У гэтым павеце ў заходніх частках жыве многа літоўцаў; ці лік 43 тысячы адказвае сапраўднасьці — мы ня ведаем. Літоўскія статыстыкі наракаюць на памылковасьць і тэндэнцыю польскіх статыстыкаў. Для нас, беларусаў, пацяшаючай праявай ёсьць факт запісаньня болей 6 тысяч каталікоў беларусамі! Гэта відаць з таго, што праваслаўных ёсьць 2 тысячы, трэба дапусьціць, што сярод іх ёсьць і расейцы, а беларусаў 8 тысяч, значыць запісалася беларусамі болей 6 тысяч беларусаў-каталікоў. Гэты факт сьведчыць аб пашырэньні нацыянальнага беларускага ўсьведамленьня і пасярод беларускай каталіцкай масы. Паводле нашага аблічэньня беларусаў у Сьвянцянскім павеце ёсьць каля 70 тысяч.

Вялейскі павет прастору 3 427 кв. км, насельніцтва 131 тысяч, на 1 кв. км. 38 чал., каталікоў 53 тыс., праваслаўных 71 тыс., жыдоў 6 тыс., іншых 1 тысяча; польская мова 59 тыс., беларуская 64 тыс., жыдоўская 6 тыс., расейская 1 тыс. Кідаецца ў вочы ў гэтай статыстыцы, як і ўсюды, розьніца паміж лікам каталікоў і лікам гаворачых папольску, лікам праваслаўных і лікам беларусаў. З гэтай розь-

ніцы відаць, што ня толькі ўсе каталікі залічаны да гаворачых папольску, але і некалькі тысяч праваслаўных. Паводле нашых падлічэньняў у Вялейскім павеце ёсьць каля 120 тысяч беларусаў.

Віленска-Троцкі павет мае прастору 5 969 кв. км., насельніцтва 214 тысяч, на 1 кв. км. 36 чал., каталікоў 201 тыс., праваслаўных 3 тыс., жыдоў 7 тыс., іншых 3 тысячы; польская мова 180 тыс., беларуская 5 з паловай тыс., літоўская 17 тыс., расейская блізу 4 тыс., рэшта жыды і іншыя. Трэба прызнаць, што ў гэтым павеце азначыць правільна лік беларусаў вельмі трудна, бо тут зыходзяцца ўплывы яшчэ двух народаў: літоўскага і польскага. Агулам бяручы, на ўсход і поўдзень ад Вільні насельніцтва гаворыць пабеларуску, а на захад і поўнач — нейкай беларуска-літоўска-польскай гутаркай, якой праз радыё гаворыць цётка Альбінова, а ў „Слове" піша Вінцук Маркотны. Куды залічыць гэту этнографічную мяшанку, мы і самі ня ведаем. Бясспрэчна, яна ёсьць паходжаньня літоўска-беларускага, аб чым сьведчаць прозьвішчы людзей і назовы мясцовасьцяў. Старэйшае пакаленьне яшчэ гаворыць палітоўску або пабеларуску, а маладзейшае ў ваколіцах Мэйшаголы, Падбярэзьзя ці Нямэнчына хватаецца ўжо за польскую мову, маючую аднак шмат слоў і граматычных формаў беларускіх або літоўскіх. Калі ня будзем лічыць гэтай мяшанкі да беларускай этнаграфічнай масы (хоць прафесар Карскі яе залічвае), калі адыймем літоўскае насельніцтва, то на долю беларусаў павінна астацца ня менш 135 тысяч.

Горад *Вільня* меў у 1931 г. 195 тысяч, з чаго каталікоў 126 тыс., праваслаўных 9 тыс., жыдоў 55 тыс., рэшта іншыя; польская мова 128 628, расейская 7 372, беларуская 1 737, літоўская 1 579; рэшта жыды і іншыя. Як бачым, сьведамых беларусаў у Вільні мала, але мыляўся-б той, хто-б думаў, што ў Вільні толькі 1 737 гаворачых пабеларуску. Ёсьць шмат беларускага работніцтва, якое ўжывае беларускай мовы, ёсьць і беларуская інтэлігенцыя, якая не чураецца роднае мовы. А што датыча „простага" віленскага народу, дык ён у большасьці ўжывае беларускай мовы. Каб праканацца ў гэтым, даволі выйсьці раненька на вуліцы Вільні. Тады работнікі, якія ідуць да працы, вазакі (дранжкары), якія едуць на свае стойлы, дворнікі, якія замятаюць вуліцу, гавораць у большасьці пабеларуску, а панаваньне польскай мовы заўважаецца ад гадзіны 7-ай, калі пачынае ісьці ў школы моладзь і да сваіх прац урадаўцы. Тады польшчына заглушае беларушчыну, бо і тыя, што гаварылі пабеларуску, пачынаюць цяпер гаварыць папольску. Бяручы ўсё гэта пад увагу мы не памылімся, калі скажам, што ў Вільні ёсьць каля 30 тысяч (а можа і болей) беларускай этнаграфічнай масы.

Падсумоўваючы такім чынам усё беларускае насельніцтва Вілен-

шчыны, мы атрымаем **845 тысяч.** Для польскіх статыстыкаў такі лік пакажацца моцна перавялічаным, але калі возьмем пад увагу сапраўдны этнаграфічны воблік Віленшчыны, дык у гэтым нашым падрахунку ня знойдзем нічога дзіўнага. Пры абрахунку паводле гмін рэзультат быў-бы для беларусаў магчыма яшчэ карысьнейшы. Ёсьць гміны, у каторых толькі пару дзесяткаў асоб гаворыць папольску. Паводле некаторых польскіх статыстыкаў Віленшчына — гэта край чыста польскі, аднак калі прыгледзецца да яе бліжэй, акажацца, што ён этнаграфічна беларускі. Гэта сьвярджаюць нават польскія дасьледчыкі, якія не займаюцца фаховай статыстыкай. І так Бр. Овчыннік у „Дзённіку Поранным", органе ZNP (з 27.IX. г.г.) так піша: „ёсьць цэлыя абшары (połacie) паветаў на Віленшчыне, дзе на прасторах некулькіх дзесяткаў кілёмэтраў уздоўж і ўшыркі жывуць выключна нацыянальныя меншасьці, дзе няма зусім мясцовага караннога польскага элементу". Якія гэта нацыянальныя меншасьці, аўтар ня кажа, але з далейшых ягоных слоў відаць, што гэта беларусы. Гэтае прызнаньне вельмі цэннае: яно пацьвярджае нашу тэзу аб большасьці няпольскага, у даным выпадку беларускага, насельніцтва на Віленшчыне.

Наваградзкае ваяводзтва.

Пераходзячы да разгляду Наваградзкага ваяводзтва, трэба сьвердзіць, што яно зьяўляецца найбольш чыстым з этнаграфічнага пункту гледжаньня беларускім ваводзтвам у Польшчы. Калі ў Віленскім ваяводзтве маем у заходніх частках літоўскае насельніцтва, у Беластоцкім — польскае, то ў Наваградзкім іншай каранной этнаграфічнай масы бадай што няма, апроч беларускай.

Баранавіцкі павет прастору 3 298 кв. км. Насельніцтва (разам з Баранавічамі) 161 тыс., на 1 кв. км. 49 чал., каталікоў 45 тыс., праваслаўных 99 тыс., жыды 16 тыс., іншых 1 тысяча; польская мова 75 тыс., беларуская 67 тыс., рэшта жыды і іншыя. Як бачым, гаворачых па-польску афіцыйная статыстыка налічыла аж 75 тысяч! Добра знаючы Баранавіцкі павет, мы сьцьвярджаем, што там у штодзённым жыцьці польскай мовы ўжываюць толькі ўрадаўцы, большыя землеўласьнікі і асаднікі, а рэшта насельніцтва (апроч жыдоў) гаворыць па-беларуску. Беларускай мовы ўжывае такжа дробная шляхта. Паводле нашых падлічэньняў гаворачых пабеларуску ў Баранавіцкім павеце ёсьць каля 140 тысяч.

Лідзкі павет прастору 4 258 кв. км., насельнітва 183 з паловай тысяч, на 1 кв. км. 43 чал., каталікоў 145 тыс., праваслаўных 23 тыс., жыдоў 15 тыс., рэшта іншыя. Польская мова 146 тыс., беларуская 20 тысяч., літоўская 2 з паловай тысячы, расейская 700 чалавек, рэшта жыды і інш. Гэты павет бадай выключна каталіцкі,

аднак каталікі гавораць пабеларуску (так як у суседнім Ашмянскім павеце); ня ведаем, на якой падстве польская статыстыка залічыла іх да гаворачых папольску. У Лідзкім павеце ёсьць і трохі літоўцаў (у ваколіцы Гераноны-Беняконі), літоўскія статыстыкі кажуць, што ёсьць іх там болей, чым паказвае польская статыстыка; калі адлічым іх, гаворачых у штодзённым жыцьці папольску а такжа жыдоў, на долю беларускую выпадзе ў Лідзкім павеце каля 155 тысяч.

Нясьвіскі павет прастору мае 1 968 кв. км., насельніцтва 114 з паловай тыс., на 1 кв. км. 58 чал.; каталікоў 22 тыс., праваслаўных 82 тыс., жыдоў 9 тыс., рэшта іншыя; польская мова 28 тыс., беларуская 76 тыс., расейская 800 чал., рэшта жыды і іншыя. Павет, у каторым ёсьць болей чым у іншых паветах дробнай шляхты, але гэта шляхта сваёй мовай, спосабам жыцьця ня рожніцца ад беларускага насельніцтва і ёсьць сама паходжаньня беларускага. Прышлых з этнаграфічнай Польшчы мала. Мы лічым у гэтым павеце беларускай этнаграфічнай масы 100 тысяч.

Навагрудзкі павет прастору 2 930 кв. км., насельніцтва 149 з паловай тыс., на 1 кв. км. 51 чал.; каталікоў 29 тыс., праваслаўных 108 тыс., жыдоў 10 тыс., рэшта іншыя. Польская мова 35 тыс., беларуская 103 тыс., расейская блізу 1 тысяча, рэшта іншыя. Гэты павет нават паводле польскай афіцыйнай статыстыкі ёсьць найболей сьведамым беларускім паветам, але мы, добра знаючы гэты павет, сьцьвярджаем, што лік 103 тысячы гаворачых пабеларуску яшчэ ня вычэрпывае ўсяе беларускае этнографічнае масы ў гэтым павеце. Паводле нашых падлічэньняў там ёсьць гаворачых па-беларуску 135 тысяч.

Слонімскі павет прастору 3 069 кв. км., насельніцтва 126 з паловай тысяч, на 1 кв. км. 41 чал.; каталікоў 24 тыс., праваслаўных 89 тыс., жыдоў 12 тыс., рэшта іншыя; польская мова 52 тыс., беларуская 62 тыс., рэшта жыды і іншыя. Беларусаў у гэтым павеце ёсьць добрых 105 тысяч.

Стаўпецкі павет прастору 2 371 кв. км., насельніцтва 99 з паловай тыс., на 1 кв. км. 42 чал.; каталікоў 38 тыс., праваслаўных 54 тыс., жыдоў 7 тыс. Польская мова 52 тыс., беларуская 40 тыс., расейская 600 чал., рэшта жыды і іншыя. У гэтым павеце беларускай этнаграфічнай масы ёсьць болей 85 тысяч.

Шчучынскі павет прастору 2 273 кв. км., насельніцтва 107 тысяч, на 1 кв. км. 47 чал.; каталікоў 60 тыс., праваслаўных 39 тыс., жыдоў 8 тыс., польская мова 89 тыс., беларуская 10 тыс. Дзіўна, адкуль польская статыстыка набрала аж 89 тысяч гаворачых папольску, калі ведама, што там насельніцтва агулам бяручы гаворыць пабе-

ларуску. Паводле нашага аблічэньня ў гэтым павеце ёсьць 95 тысяч беларусаў.

Валожынскі павет прастору 2 799 кв. км., насельніцтва 115 з паловай тысяч, на 1 кв. км. 41 чал.; каталікоў 62 тыс., праваслаўных 48 тыс., жыдоў 5 тыс. Польская мова 77 тыс., беларуская 33 тысячы; паводле нашага аблічэньня ў Валожынскім павеце ёсьць беларусаў 105 тысяч.

Падсумоўваючы ўсю беларускую этнаграфічную масу Наваградзкага ваяводзтва атрымаем **920 тысяч.**

Беластоцкае ваяводзтва.

Падлічэньне беларускага насельніцтва ў Беластоцкім ваяводзтве будзе труднейшае, чым у Наваградзкім, бо ў ім ёсьць паветы этнаграфічна мяшаныя польска-беларускія.

Этнаграфічная мяжа аднак даволі выразная, яна праходзіць меней-болей ад Аўгустова простападла па поўдзень па лініі Штабін, Кнышын, Хорашч, Боцькі, Мілейчыцы, Мельнік над Бугам, там ужо сутыкаецца з украінскай этнаграфічнай масай. На гэтай мяжы здараюцца такія мясцовасьці ў Беластоцкім і Бельскім паветах, дзе гавораць нейкай польска-беларускай гаворкай, як „прысэд", „напрэціў", „грэхі" і г.п. Куды залічыць гэтую „мову"? Ясна, што палякі залічваюць яе да польскай, а беларусы — да беларускай. Але гэтакія моўныя дзівосы далёка ўглыб аднэй ці другой этнографічнай тэрыторыі не заходзяць, затым падлічэньні з гэтага боку не напатыкаюць на большыя труднасьці.

Горадзенскі павет (з Горадняй) 4 459 кв. км., насельніцтва 213 тысяч, на 1 кв. км. 48 чал., з гэтага *сам павет* насельніцтва мае 163 з паловай тысячы, каталікоў 67 з паловай тысяч, праваслаўных 81 тыс., жыдоў 14 з паловай тыс.; польская мова 77 з паловай тыс., беларуская 62 з паловай тысячы, літоўская 6 тысяч, расейская 2 тысячы, рэшта жыды і інш. Гэты павет бадай увесь этнаграфічна-беларускі, толькі на поўначы жыве ня многа літоўцаў, адлічыўшы іх, жыдоў а также гаворачых папольску, беларусаў будзе каля 130 тысяч. Горад *Городня* мае насельніцтва 50 тыс., каталікоў 21 тыс., праваслаўных 6 тыс., жыдоў 21 тысяча, польская мова 23 458, беларуская 1 261, расейская 3 730. У Горадні беларускай этнаграфічнай масы мы лічым 20 тысяч. Значыць увесь павет 150 тысяч.

Ваўкавыскі павет прастору 3 938 кв. км., насельніцтва 171 тысяч, на 1 кв. км. 43 чал.; каталікоў 76 тыс., праваслаўных 77 тыс., жыдоў 13 тыс.; польская мова 83 тыс., беларуская 72 тыс., расейская блізу 3 тысяч. На наш пагляд гэты павет, так як і Горадзенскі ёсьць этнаграфічна-беларускім паветам і гаворачых пабеларуску ў ім ёсьць каля 155 тысяч.

Сакольскі павет прастору 2 333 кв. км., насельніцтва 103 тысяч, на 1 кв. км. 44 чал.; каталікоў 81 тыс., праваслаўных 13 тыс., жыдоў 8 з паловай тыс.; польская мова блізу 93 тыс., беларуская блізу 2 тыс., рэшта жыды і іншыя. Гэты павет ёсьць у вялізарнай большасьці каталіцкі, дык польскія статыстыкі залічаюць яго да паветаў польскіх, аднак гэта памылкова. Гавораць там чыстай беларускай мовай, якую нам перадаў польскі этнограф Федароўскі ў сваёй працы „Lud biaioruski" (4-ты том выдала нядаўна Польская Акадэмія Навук у Кракаве), а заходнія часткі павету, якія найболей падлягаюць польскім уплывам, далі шмат беларускіх дзеячоў. Гаворачых пабеларуску ў гэтым павеце ёсьць каля 80 тысяч.

Беластоцкі павет (без Беластоку) мае прастору 3 079 кв. км., насельніцтва 140 тысяч, на 1 кв. км. 45 чал.; каталікоў 105 з паловай тысяч, праваслаўных 22 тыс., жыдоў 11 тыс., рэшта іншыя. Польская мова блізу 117 тыс., беларуская блізу 10 тыс., расейская блізу 2 тысяч. Гэты павет мяшаны: польска-беларускі. Заходнія часткі павету належаць да польскй этнаграфічнай тэрыторыі, а цэнтральныя з г. Беластокам і ўсходнія — да беларускай. Трэба прызнаць такжа, што палянізацыя ў цэнтральных частках павету зрабіла вялікія поступы, асабліва на захад ад Беластоку, аднак трэба сьцьвердзіць, што большасьць павету гаворыць пабеларуску, хоць у цэнтральнай частцы сапсутым акцэнтам, што дало павод некаторым польскім статыстыкам залічваць гэты павет да этнаграфічна польскай тэрыторыі, а некаторым украінскім частку (каля Заблудава) да этнаграфічнай украінскай тэрыторыі. Дзеля гэтага на некаторых украінскіх картах украінская этнаграфічная тэрыторыя паказана аж пад Беласток або і далей. Мы аднак, знаючы добра гэты павет, сьцьвярджаем, што ўкраінскага насельніцтва там няма, а польскае жыве на захад ад лініі Добрынёва-Кнытым [мабыць памылка друку, патрэбна Кнышын — А. В.]-Далістово, а на ўсход беларускае, якога-ж ёсьць каля 90 тысяч. Беластоцкі павет чакае на свайго этнографа. Горад *Беласток* насельніцтва мае 91 тыс., каталікоў 41 з паловай тысяч, праваслаўных 7 з паловай тыс., жыдоў 39 тыс. Польская мова 46 тыс., расейская блізу 4 тысяч., рэшта жыды і інш. Беларусы ў польскай статыстыцы не азначаны. Чаму? Мы ведаем, што там ёсьць многа беларускага работніцтва, было ў сваім часе многа беларускіх арганізацыяў, дык беларусы ў Беластоку ёсьць і нават у даволі значнай колькасьці. Мы азначаем лік беларускай этнаграфічнай масы ў Беластоку найменш на 20 тысяч.

Бельскі павет прастору 4 988 кв. км., насельніцтва 202 тысяч, на 1 кв. км. 41 чал.; каталікоў 91 тыс., праваслаўных 91 тыс., жыдоў 18 тыс., рэшта іншыя. Польская мова блізу 111 тыс., беларуская 58

тыс., расейская 12 з паловай тыс., украінская блізу 2 тысяч. Гэты павет таксама мяшаны — польска-беларускі, як і Беластоцкі з невялікай колькасьцю ўкраінцаў. Апіраючыся на тым што праваслаўная палавіна гэтага павету гаворыць паўднёвым беларускім дыялектам, зблiжаным да ўкраінскай мовы, украінскія этнографы залічаюць яе да ўкраінскай этнаграфічнай масы, аднак гэта няслушна, так як няслушна залічылі расейскія этнографы паўночныя чатыры паветы Чарнігаўшчыны (Суражскі, Новазыбкаўскі, Мглінскі і Старадубскі), тры паветы Віцебшчыны (Вяліжскі, Невельскі і Себежскі) а также ўсю заходнюю часьць Смаленшчыны да расейскай этнаграфічнай масы і далучылі да Расеі (РСФСР). Трэба ведаць, што беларускія дыялекты ёсьць розныя, на поўначы і на ўсходзе яны зблiжаны да расейскай мовы, а на поўдні — да ўкраінскай, але гэта зблiжэньне не дае падставы залічваць тое насельніцтва, якое іх ужывае, да расейскай або ўкраінскай этнаграфічнай масы. Дый яно само сябе азначае беларусамі, як гэта бачым у Бельскім павеце. Там украінскіх уплываў няма, а ёсьць толькі беларускія. Дзеля гэтага праваслаўную палавіну павету мы залічваем да беларускай этнаграфічнай масы, а также тых каталікоў, якія ўжываюць дома беларускую мову. Трэба яшчэ адзначыць, што няма ў гэтым павеце такога вялікага ліку расейцаў, як гэта паказана ў афіцыяльнай статыстыцы (болей 12 тысяч), там іх ёсьць ня болей пару сот асоб, так як і ў іншых паветах. Дзеля гэтага ўважаем, што лік беларусаў у Бельскім павеце выносіць найменш 110 тысяч.

Агляд Беластоцкага ваяводзтва ня можна скончыць, не разгледзеўшы яшчэ *Аўгустоўскага* павету, які ляжыць на захад ад Горадні і падыходзіць пад самую Горадню. І там жывуць беларусы. Прафесар Карскі, які асабіста ў 1901 г. зьведаў этнаграфічную лінію, налічваў іх 38 тысяч, г.зн. палавіну Аўгустоўскага павету. І сапраўды там яшчэ цяпер у ваколіцах Сапоцкінь, Ліпска, Штабіна аж пад сам Аўгустоў гавораць пабеларуску. Прастору гэты павет мае 2 035 кв. км., насельніцтва 75 тысяч, на 1 кв. км. 36 чал.; католікоў 67 тыс., праваслаўных ня цэлая тысяча, жыдоў 4 тыс., рэшта іншыя. Польская мова блізу 111 тыс., беларуская 58 тыс., расейская 12 з паловай тыс., украінская блізу 2 тысяч. Беларусаў у афіцыйнай статыстыцы не паказана зусім, усе каталікі запісаны да гаворачых папольску, мы, аднак, ня гледзячы на поступы палянізацыі, лічым там 35 тыс. беларусаў. Жыве некаторая колькасьць беларусаў і ў *Сувалскім* павеце (у трыкутніку паміж Нёманам і Аўгустоўскім каналам), але лік іх там невялікі, каля 5 тысяч.

Такім парадкам у ўсім Беластоцкім ваяводзтве, поводле нашых аблічаньняў ёсьць **645 тысяч** беларускай этнаграфічнай масы.

Палескае ваяводзтва.

Азначыць лік беларускай масы ў Палескім ваяводзтве можа трудней, чым у Беластоцкім. Труднасьці паўстаюць перад усім з тэй прычыны, што насельніцтва Палескага ваяводзтва ёсць у большасьці сапраўднай этнаграфічнай масай, ня ведаючай, куды сябе залічыць, да беларусаў ці ўкраінцаў. Самі сябе яны называюць часьцей паляшукамі, але трэба прызнаць, што ў апошніх гадох нацыянальнае ўсьведамленьне ў іх значна пашырылася, прыгэтым паўночнае Палесьсе азначае сябе беларускім, а паўднёвае — украінскім. Ёсьць надзея, што за пару дзесяткаў гадоў яно азначыць сябе аканчальна і тады аўтаматычна зьнікнуць прычыны да спрэчак паміж беларусамі і ўкраінцамі за Палесьсе. Вялікай перашкодай у скорым і поўным самаазначэньні ёсьць спэцыяльная тэндэнцыя некаторых польскіх дзейнікаў, а паміж іншым і Галоўнага Статыстычнага Ураду ў Варшаве. Тэндэнцыя некаторых польскіх дзейнікаў ідзе да таго, каб *недапусьціць беларускіх і польскіх уплываў на Палесьсе,* а Галоўны Статыстычны Урад да сьпісу 1931 году наладзіў быў адумысловую анкету на пытаньне, якія рубрыкі ўводзіць у сьпісныя аркушы? Найбольшую ўвагу ў гэтай анкеце зьвярнулі на вырашэньне пытаньня, якім спосабам вызначаць нацыянальнасьць грамадзян: ці на падставе мовы, якой яны ўжываюць, ці на падставе іх заяваў аб сваёй нацыянальнасьці? Пасьля доўгай дыскусіі Галоўны Статыстычны Урад прыняў першую канцэпцыю, іменна, каб вызначаць нацыянальнасьць грамадзян на падставе мовы, якой яны ўжываюць. Якую мэту мелі афіцыйныя польскія дзейнікі ў такім вырашэньні справы, згадаць трудна, але трэба прызнаць, што гэтае вырашэньне памагло і нам рабіць свае статыстычныя падлічэньні, бо і мы апіраемся на моўных азнаках і залічаем да беларускага народу тых, хто ў сваім штодзённым жыцьці ўжывае беларускай мовы.

Але Галоўны Статыстычны Урад увёў яшчэ адну, неспатыканую, здаецца, нідзе на сьвеце, рубрыку *тутэйшых*. У гэтай рубрыцы перапісчыкі мелі зьмяшчаць усіх, хто ня мог азначыць сваёй нацыянальнасьці або сваёй мовы. Думка сама па сабе можа і добрая, (бо сапраўды некаторыя не могуць азначыць сваёй народнасьці і нават мовы, якой ужываюць у штодзённым жыцьці), але пад варункам, каб яна была праводжана на *ўсім* абшары Дзяржавы, тады ў кожным павеце магчыма знайшлося-б пару сотак (ці тысяч) асоб, якія дзеля тых ці іншых прычын не змаглі азначыць сваёй нацыянальнасьці. Аднак слабою стараною гэтай канцэпцыі было тое, што яна праводзілася толькі на абшары Палескага ваяводзтва! Зараз за межамі гэтага ваяводзтва, хоць там насельніцтва зусім падобнае, рубрыка „тутэйшых” пустуе, затое

ў Палескім ваяводзтве ў гэтых рубрыках сотні тысяч!

Беларусы, робячы статыстычныя досьледы на абшары сяньняшняга Палескага ваяводзтва звычайна паклікаюцца на *гістарычную мяжу*, якая аддзяляла даўняе Вялікае Княства Літоўска-Беларускае ад Валыні, якая даўней належала да „Кароны", г.зн. Польшчы (адрож. „Карона" і „Літва"). Гэтая мяжа праходзіла па граніцы даўнейшых Горадзенскай і Менскай губэрняў і абыймала сяньняшнія паўднёвыя паветы Палескага ваяводзтва: Столінскі, Пінскі, Драгічынскі, Кобрынскі, Берасьцейскі. Гістарычная мяжа асталася ў памяці народу, які чуецца болей зблiжаным да Беларусі, чым да Украіны. Але ці на гэтай мяжы можна апірацца на даўжэйшую мэту ў сучаснасьці? Здаецца, што не, бо ў некаторых паветах (напрыклад Драгічынскі, Кобрынскі) украінскія ўплывы большыя за беларускія і паводле некаторых прымет насельніцтва тамашняе, асабліва ў паўднёвых частках гэтых паветаў, належыць да ўкраінскай этнографічнай масы. Уважаем прыгэтым, што прэтэнсіі некаторых украінскіх палітыкаў і этнографаў да ахапленьня і паўночных частак Палескага ваяводзтва ня маюць пад сабою ніякіх падстаў. Але пярэйдзем да агляду паасобных паветаў.

Лунінецкі павет прастору мае 5 678 кв. км., насельніцтва 108 з паловай тысяч, на 1 кв. км. 19 чал. (многа незаселеных балот!); каталікоў 14 тыс., праваслаўных 86 тыс., жыдоў 8 тыс., польская мова 16 з паловай тыс., беларуская блізу 3 тысячы, „тутэйшая" 80 тысяч, рэшта жыды і іншыя. Як бачым, гаворачых „патутэйшаму" найболей! Якая гэта мова і чаму яна завецца „тутэйшай", афіцыйная статыстыка не гаворыць. Выглядае, што толькі гэтая неазначаная мова ёсьць „тутэйшай", а ўжо беларуская, украінская або і польская, хоць-бы ёю нехта і гаварыў у Лунінецкім ці іншым павеце, ужо ня будзе „тутэйшай"! У гэтай супярэчнасьці і ляжыць слабое месца ўсёй канцэпцыі „тутэйшасьці". Мы лічым увесь Лунінецкі павет за этнаграфічна беларускі і беларускай этнаграфічнай масы лічым там найменш 95 тысяч.

Косаўскі павет прастору 3 562 кв. км., насельніцтва блізу 84 тыс., на 1 кв. км. 23 чал.; каталікоў 8 тыс., праваслаўных 69 тыс., жыдоў 6 тыс.; польская мова 8 з паловай тыс., беларуская 14 тыс., „тутэйшая" блізу 54 тыс., рэшта іншыя. Гэты павет этнаграфічна беларускі і гаворачых пабеларуску там ёсьць 75 тыс.

Пружанскі павет прастору мае 2 644 кв. км., насельніцтва 108 з паловай тысяч, на 1 кв. км. 41 чал.; каталікоў 16 тыс., праваслаўных 82 тыс., жыдоў 9 тыс.; польская мова 18 тыс., беларуская 24 тыс., „тутэйшая" 56 тыс., рэшта жыды і іншыя. Павет таксама этнаграфічна беларускі мае беларусаў найменш 95 тыс.

Столінскі павет прастору 5 389 кв. км., насельніцтва 125 тыс., на 1 кв. км. 23 чал.; каталікоў 8 тыс., праваслаўных 104 тыс., жыдоў блізу 11 тыс.; польская мова 18 з паловай тыс., беларуская блізу 5 тыс., украінская блізу 3 тыс., „тутэйшая" 80 тысяч. Гэты павет таксама этнаграфічна беларускі, толькі ў паўднёвай частцы жыве каля 20 тысяч украінцаў, а беларусаў у гэтым павеце мы лічым да 90 тысяч.

Пінскі павет прастору мае 5 631 кв. км., насельніцтва (разам з Пінскам) 184 тыс., на 1 кв. км. 33 чал.; *павет* насельніцтва 152 тыс., каталікоў 10 тыс., праваслаўных 135 тыс., жыдоў 5 тыс.; польская мова блізу 22 тыс., беларуская 5 тыс., „тутэйшая" 118 тыс., украінская не азначана. Чаму? Мы ўважаем гэты павет за этнаграфічна мяшаны: беларуска-ўкраінскі, на поўдзень ад Піны ўкраінцы ў большасьці, хоць ёсьць там і беларусы, па суседзтву з Столінскім паветам, а на поўнач воласьці чыста беларускія. Беларусаў у Пінскім павеце мы налічваем каля 85 тысяч. Горад *Пінск* 32 тысячы, каталікоў 6 тыс., праваслаўных 5 тыс., жыдоў 20 тысяч; польская мова 7 346 чал., беларуская 592 чал., расейская 2 866, украінская не азначана. Мы ўважаем, што ў Пінску жыве беларусаў найменш 5 тысяч, значыць у ўсім павеце 90 тысяч.

Драгічынскі і Кобрынскі паветы ў большасці ўкраінскія, беларускія ўплывы там слабыя; хоць трэба сьцьвердзіць, што паўночныя часткі паветаў заселены беларусамі. Польская статыстыка беларусаў у Драгічынскім павеце не падала зусім (украінцаў 1 439 чал.), а ў Кобрынскім украінцаў 22 тысячы, а беларусаў 5 тысяч, рэшта „тутэйшыя". Мы лічым, што ў гэтых абодвых паветах беларусаў ёсьць болей 50 тысяч. (Усяго Драгічынскі павет мае 97 тыс., а Кобрынскі 115 тысяч.)

Берасьцейскі павет прастору 4 625 кв. км., насельніцтва 216 тыс., на 1 кв. км. 47 чал.; сам *павет* мае насельніцтва 167 з паловай тыс., каталікоў 25 тыс., праваслаўных 127 тыс., жыдоў блізу 11 тыс.; польская мова блізу 30 тыс., беларуская блізу 16 тыс., украінская 17 з паловай тыс., „тутэйшая" 93 тысячы. Гэты павет мяшаны: беларуска-ўкраінскі, уплывы там бадай роўныя, на поўнач ад Берасьця жывуць беларусы, а на поўдзень украінцы. Беларусаў у Берасьцейскім павеце мы лічым каля 75 тысяч. Горад *Берасьце* насельніцтва 48 тысяч, каталікоў блізу 18 тыс., праваслаўных блізу 9 тыс., жыдоў 21 з паловай тысяч; польская мова 20 тыс., беларуская 1 327 чал., украінская не азначана, расейская 2 з паловай тыс. Мы лічым у Берасьці каля 5 тысяч беларусаў; значыць у цэлым павеце 80 тысяч.

Падсумоўваючы беларускае насельніцтва Палескага ваяводзтва атрымаем **575 тысяч.**

Але беларусы жывуць не толькі на беларускай этнаграфічнай тэ-

рыторыі, яны жывуць яшчэ і ў іншых ваяводзтвах. Паводле афіцыйнай польскай статыстыкі ў Валынскім ваяводзтве ёсьць 2 400 беларусаў, у Люблінскім 1 200, а также ў некаторых іншых дробныя лічбы. Ведаем таксама (хоць аб гэтым польская статыстыка маўчыць), што па большых гарадох Польшчы знаходзяцца беларусы, і так у адной Варшаве ёсьць каля 2 000 беларусаў, куды яны выехалі на працу. Сколькі ёсьць усіх, рассеяных па ўсёй Польшчы беларусаў, згадаць трудна, а статыстыкі ў гэтым кірунку ніхто не рабіў, але нам здаецца, што іх ёсьць болей 20 тысяч.

Такім парадкам лік усёй беларускай масы ў Польскай дзяржаве прадстаўляецца так:

— Віленскае ваяводзтва ..... 845 тысяч
— Наваградзкае ..... 920 тысяч
— Беластоцкае ..... 645 тысяч
— Палескае ..... 575 тысяч
Усяго ..... 2 985 тысяч

Калі дабавім яшчэ 20 тысяч рассеяных па ўсёй Польшчы, атрымаем *тры мільёны і 5 тысяч* беларусаў у Польшчы. Але лік гэты адносіцца да 1931 году, за 6 гадоў насельніцтва Польшчы прыбыло каля 2 мільёнаў 600 тысяч, гэта значыць каля 8 працэнтаў. Але трэба ведаць, што плоднасьць на ўсходзе Польшчы большая, чым на захадзе або ў цэнтральных правінцыях і мы не памылімся, калі скажам, што беларусаў прыбыло ня 8 але 10 працэнтаў, значыць 300 тысяч чалавек, што дасьць у суме **3 мільёны 300 тысяч** беларусаў у Польшчы. Магчыма, што гэтую лічбу польскія статыстыкі будуць аспрэчваць, закідаючы, што яна толькі прыпушчальная і робленая паводле падрахунку „на вока”, але мы можам заявіць на гэта, што каб беларусам была дадзена магчымасьць аблічэньня сваёй этнаграфічнай масы з афіцыяльнымі сьпіскамі ў руках, дык лічба ня толькі не была-б меншая, але магчыма яшчэ большая.

„Беларускі Фронт” № № 11 (20) - 13 (22) ад 1937 г.